# ВАЕННАЯ ЮСТЫЦЫЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ ССР У ПЕРЫЯД ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (1941—1945 гг.)

**Васілёнак Г.К.**

*БГЭУ (Мінск)*

Цыцерону належыць вядомая фраза: «Калі грыміць зброя, законы маўчаць». Разам з тым, з гэтым выслоўем мы можам паспрачацца.

Ва ўмовах ваеннага становішча 1941-1945 гг. на неакупаванай тэрыторыі Беларускай ССР рэзка ўзрасла роля ваенных трыбуналаў. Гэта было выклікана неабходнасцю стварэння строгага парадку і дысцыпліны ў Рабоча-сялянскай Чырвонай арміі і асабліва ў прыфрантавой паласе. У гэты час прымаюцца меры па ўмацаванні законнасці працэсуальных гарантый і адзінства судовай практыкі пры ажыццяўленні правасуддзя ў баявых умовах. Гэта патрабавала значнага пашырэнне падсуднасці спраў ваенных трыбуналаў, а таксама ўзмацненне карных функцый ваенна-судовай сістэмы.

Эфектыўнасць дзейнасці ваенных трыбуналаў была павышана за кошт пераўтварэння ў ваенныя трыбуналы судоў агульнай юрысдыкцыі, чыгуначнага і воднага транспарту, а таксама фарміраванне ваенных трыбуналаў у стралковых дывізіях у мэтах максімальнай адпаведнасці структуры вайсковых фарміраванняў. Замест выбарнасці ваенных суддзяў быў уведзены прынцып іх прызначэння. Таксама былі прыняты пэўныя меры па ўмацаванні законнасці працэсуальных гарантый адзінства судовай практыкі пры ажыццяўленні правасуддзя ў баявых умовах з шырокім асвятленнем ваенна-судовай практыкі ў друкаваных СМІ. Менавіта гэта выклікала вяртанне да арганізацыі і дзейнасці ваенных трыбуналаў, як карных органаў і адмова ад ранейшых даваенных тэндэнцый збліжэння ваенна-судовых органаў з сістэмай агульных судоў. Быў скасаваны касацыйны парадак абскарджання прысудаў ваенных трыбуналаў.

Разам з тым, адмена касацыйнага абскарджання прысудаў часткова была кампенсавана дзейнасцю выязных сесій Ваеннай калегіі УС СССР у парадку судовага нагляду, удзелам у судовым працэсе засядацеляў, у дыферэнцыяваным абранні мер пакаранняў, правам ваеннага камандавання прыпыняць выкананне прысудаў да вышэйшай меры пакарання, узмацненнем функцый судовага кіравання Народны камісарыят юстыцыі СССР.

Ажыццяўленне правасуддзя ў партызанскіх узброеных фарміраваннях на акупіраванай тэрыторыі СССР выконвалася камандаваннем партызанскіх атрадаў. Яны дзейнічалі як ваенна-судовыя органы ў адпаведнасці з заканадаўствам БССР. Але з архіўных матэрыялаў вядома, што мелі месца такія выпадкі, як фабрыкаванне крымінальных спраў і прымяненне максімальных санкцый без уліку прэзумцыі невінаватасці абвінавачанага.

Таксама камандаванне партызанскіх атрадаў часта замяняла вышэйшую меру пакарання, іншымі відамі пакарання, а дзеючыя партызанскія суды, трыбуналы, і ваенна–палявыя трыбуналы ў працэсе ажыццяўлення правасуддзя праводзілі актыўную працу па прафілактыцы правапарушэнняў. Гэта ўмацоўвала права, парадак і дысцыпліну ў партызанскіх узброеных фарміваннях і сярод мірнага насельніцтва. Архіўнымі крыніцамі даказана, што ў партызанскіх узброеных фарміраваннях вядучую ролю ў пакаранні злачынцаў адыгрывалі Асаблівыя аддзелы і камандаванне партызанскіх атрадаў. У якасці ваенна-судовых органаў яны ўносілі заключэнні і выдавалі загады аб прыцягненні да крымінальнай адказнасці з вызначэннем меры пакарання шпіенам, здраднікам Радзімы, бандытам, дэзерцірам, марадзерам і іншым злачынцам у адпаведнасці з заканадаўствам БССР.

Механізм дзейнасці ваенна-палявых судоў, як асаблівых карных органаў па адносінах да ваенных злачынцаў і іх памагатых не быў прыстасаваны для эфектыўнага выканання ўскладзеных на іх функцый ва ўмовах актыўных наступальных аперацый Чырвонай арміі. У сувязі з гэтым на вызваленых ад нямецкай акупацыі тэрыторыях БССР асноўную працу па прыцягненні да крымінальнай адказнасці ваенных злачынцаў і іх памагатых праводзілі ваенныя трыбуналы.

## ПИНСКОЕ ГЕТТО КАК СИМВОЛ ТИРАНИИ НЕМЕЦКИХ ОККУПАНТОВ

**Гавриленко Д.В., Лемешевский О.О.**

*Военная академия Республики Беларусь (Минск)*

Торжественно-траурный перезвон хатынских колоколов днем и ночью разносится по Белоруссии. Густой автомобильный поток с утра до вечера мчится по логойскому тракту, устремляясь к лесной развилке с шестью огромными пепельно-серыми буквами – «Хатынь». Некогда глухая, ничем не примечательная деревенька стала народным памятником, образным воплощением скорби и героизма белорусов в их невиданной по напряжению борьбе с иноземными захватчиками.

Символ безмерных испытаний белорусов — Хатынь, представляющая 136 белорусских деревень, в том числе и еврейский гетто, уничтоженные в годы войны вместе с их жителями. Да, гитлеровцы не прочь были уничтожить в Белоруссии всех и все, чтобы на десятилетия ликвидировать всякие условия для существования белорусов. За три года войны они сумели стереть с лица белорусской земли 209 городов и городских поселков, 9200 деревень.

В своём докладе я хотел бы рассказать о Пинском еврейском гетто, в котором было уничтожено 50 000 евреев.